ціянскага сымбалю Беларусі. Міхал *Струк* — герой мінулай вайны з Мазыршчыны.

У беларускай тапаніміцы гэтае слова досыць рэдкае. *Струкачоў* — вёска недалёка ад Кармы і *Струкі* — каля Буда-Кашалёва на Гомельшчыне.

## Стрэс

***Антаніна Хатэнка***

Сьцятыя вусны, сьціснутыя кулакі, сашчэпленыя сківіцы, ссунутыя пахмурыя бровы, сасьлеплыя вочы — *стрэс*. Растрэскваюцца маланкі *стрэсу*, і мы гасім іх у сабе: каб не высоўваліся. Мы, бывае, ператвараемся ў хісткія цені, здатныя адно жаліцца й стагнаць, — аберагаем ад сябе вакольле. Куды ж ужо болей — здагадваемся — ва *ўстрэсеную* прастору нашае Краіны? Уключаеш радыё — трасе *стрэс*, высьвечваеш экран тэлевізара — навальваецца *стрэс*, разгортваеш газэту — апынаешся ў абдоймах *стрэсу*. Вытрасены зьмест жыцьця, абтрэсенае, як дзічкі, хараство. *Стрэс* палымяным дротам абвівае цела. *Стрэс*, аголены боль, як выгінастая зьмяюка, прапаўзае між мною й людзьмі, мною й родам, між мною й дзяржаваю. *Стрэс* расшчапляецца на агністыя аскепкі, якія колка ўпіваюцца ў думкі. *Стрэс* выкручваецца, зьвіваецца злоснаю спружыністаю гадаўкаю, скрыўджана шыпіць і надзімаецца, адтапырыўшы ганарлівыя вусы. Пякучае драціньне *стрэсу* абпальвае душы. Сьвет робіцца чырвона-пагрозьлівым альбо шэрачорным. Ад злосьці ажно зялёна ўваччу. *Стрэс* бязьлітасна б'е токам пагрозаў ды зманлівых абяцанак па валокнах нэрваў. Мы — Краіна пад высокаю напругаю. А *стрэс* пакручвае сабе хвастом ды ўладарыць — правіць шыкоўны баль нашага растрасаньня, аздобленага смакаўною трасянкаю. А як хораша *стрэсу* валодаць *раСТРЭСенымі* на маўклівыя панурыя купкі баязьліўцамі! Ці ж мы ўсе *страсянутыя*? Нясем жа, рассыпаем па сьвеце *ўСТРЭСеныя* думкі й пачуваньні — і трасемся звыкла ў калатуне. А чаго, братове, дрыжым? — каб хто спытаў... Вусаты *стрэс*, разьюшаны, з уздыбленаю гняўліва поўсьцю й сьмяротным шуганьнем у вачох усяго толькі навучае нас вытрасаць з вантробаў *стрэс* — страх быць Сабою на сваёй зямлі.

## Ступа

***Рыгор Барадулін***

*Ступа* — папярэдніца жорнаў, сродак перамяшчэньня Бабы-Ягі, праобраз ракеты. Мядзьведзь у казцы просіць яму паслаць на начлег рад каменьня, рад паленьня, зялезную *ступу* пад галаву.

На першы позірк, дужа ўсё проста: прадзяўбаная атворына ў калодзе ці стаўпе (адсюль можа й само слова „*ступа*") ды абчасанае ўручча, якое таўкачом завецца. Але ў простасьці заўсягды адмысловасьць і дасканаласьць.

Засыпаецца зерне ў расшчэрыну *ступы*, і таўкач таўчэ, *сту́пае*, *ступа́е*, *наступае*. Зерне неахвотна расстаецца са сваёй унікальнай па трываласьці апраткай, зрабіўшыся голым, пачынае звацца „крупамі". Крупы прасяныя, ячныя, груца. З круп — крупеня. Калі мала іх у катле гатуецца,